**Цэна асобнага нумэру 5 кап.**

Год трэци Вильня 9 (22 мая) 1908 г. № 10.

Цэна з перэсылкою и дастаукою да хаты: на 1 г.— 3 р., на 6 мес.— 1 р. 50 кап., на 3 м.—75 к., на 1 мес.—25 к. Без дастауки и перэсылки: на 1 г.— 2 р. 40 к., на 6 м.— 1 р. 20 к., на 3 мес.—60 к., на 1 мес.—20 к. За границаю: на 1 г.— 4 р., на 6 мес.— 2 р., на 3 мес.— 1 р. Перэмена адрэсу — 20 кап.

# Наша Нива

## Першая Беларуская Газэта з Рысунками

**Выходзиць раз у тыдзень рускими и польскими литэрами.**

Падписка прынимаецца и прадаюцца атдзельные нумэры газэты 1) У Кант. „Нашай Нивы“ — Виленская вулица дом № 20, 2) У Книгарни „Знание“— Георгиевски праспэкт дом № 4. 3) У Книгарни Литоуской М. Пясэцкой — Шлапэлис, Доминиканская вулица дом № 13.

Адрэс рэдакцыи и администрацыи: **Вильня, Виленская вулица, дом № 20.**

Абъяуленя прынимаюцца на наследней странйцы на 20 кап. за линейку малыми литэрами. Рукаписы и корэспондэнции, прысланные у рэдакцию, мусяць быць чытацельна написаны з праудзивою фамилиею и адрэсом таго, хто ие прысылае. Можна такжэ падписаць прозвищэ разом з фамилиею, хто незахочэ, каб была надрукована праудзивая фамилия. Адрэс и фамилия тольки для ведама рэдакции.

**Рэдакция и кантора «Нашае Нивы» пераехала на новую кватэру на *Виленскую вулицу дом № 20* (рог Новай вул.).**

## У Думе и каля Думы.

—о—

*50-ае заседаньне.* Дума зацьвярдзила кольки дробных законоў.

* * *

*51-ае и 52-ое заседаньня.* Разгледали расходы на жалезные дароги. Аказваецца, што з их ня тольки нима даходу, а ешчэ казна мусиць дакладаць каля 100 мильёноў руб. Дума прызнала, што гаспадарка на жалезных дарогах вядзецца дрэнна и без толку; Дума мусиць выбраць сваю камисию, катарая добра разбярэ ўсю гаспадарку на жалезных дарогах и скажэ, што трэба зрабиць, каб быў лад и парадак. Гэтак и па других царствах ёсць ўсюды такая *парлямэнтская (думская) камисия.* — На ўсё гэта министэр финансоў, Коковцов, атказаў, што тую камисию зробиць не Дума, а правицельства, бо „*у нас, дзякаваць Богу, ешчэ нима парлямэнта!*“ —За гэта ўся Дума, апроч „правых“ с Пурышкевичэм, вельми абидзилась: як-бы там ни было, а Дума (Парлямэнт) у нас ёсць, дый неякие правы маем.

* * *

*53-яе 54-ае заседаньня.* Дума згодзилась прызваць стольки новабранцоў, кольки назначыў васнны министэр.—Дэп. Крупенски и „правые“ хацели, каб Дума пастанавила саўсим не браць у салдаты жыдоў дзеля таго, што яны разводзяць у войску рэволюцию, и дзеля инншых прычын. Але на гэта Дума не прыстала.

* * *

*55-ае заседаньне.* Дума зацьвярдзила расходы на суды.

„Левые“ и „ка-дэты“ гаварыли, што суд и судзьи павинны залежыць тольки ад закону, а ў Расеи цяпер суд нецикавы, бо министэр и правицельства камандуе судами, як судзидь, и судзьи не заўсягды судзяць справедлива. Напрыклад, за палитычные справы и за газэты судзяць яны так, як хочэ правицельства; судзёў, каторые гэтак ня робяць, выганяюць са службы.

Дэпутат ад рускаго насельньня Виленскай губэрни — Замыслоўски („правы“) атказваў, што дэпутаты социал-дэмократы так строга гаворадь аб судзе, бо суд высылае ў катаргу их таварышоў социалистоў. — Прадседацель Думы сказаў на гэта д. Замыслоўскаму, каб ня крыўдзиў такими словами дэпутатоў социал-дэмократоў.

Далей абсуждали расходы на турмы. Як зьявиўся начальник глаўнага турэмнага упраўленьня — Курлов (ён раней быў минским губэрнатаром), „левые“ спаткали яго

надта непрыхильна.—„Левые“ дэпутаты разбирали, якие дрэнные у нас турэмные парадки и якое цяжкае жыцьце вядуць ў их угалоўные, а найбольш палитычные арэштанты.—Дэп. Замыслоўски бараниў турэмнае упраўленьне и парадки ў турмах.

* *
*

На *56-ым заседаньню* абсуждали расходы на самае глаўнае министэрства—ўнутрэных дзел, каторае упраўляе ўсеми справами ў царстве. Да яго належаць губэрнатары, земские начальники, палиция, жандармы, почта и тэлеграф, мэдыцына, ўсяки парадак ў гасударстве.

Ад партии народнай свабоды гаварыў *Маклакоў*; гэтая партия даводзила, што парадак, каторы цяпер завяло министэрства ўнутрэных дзел у краю, дрэнны; и народ и багацства краю марнеюць, а спосабы, каторые ужывае министэрства, не давядуць да добраго канца.—Баранили министэрства *Пурышкевич* и *Замыслоуски*.

Дэпутат *Кузнецов* (рабочы) ад имени социал-дэмократоў казаў Думе, каб не даць грошы на министэрства ўнутрэных дзел, бо 1) министэрства, маючы ў руках ўсю силу, палицию и пр., найбольш винавата ў тым, што ў Расеи народ прыциснуты и ня мае нияких правоў; 2) на министэрства гэта выдаецца 95 мил. руб., з каторых 63 мил. р. идзець на палицию, а яна займаецца найболей вайной з народнай свабодай и не дае народу самому займацца устройствам жыцьця; 3) гэтые грошы аддаюцца на администрацию, (на губэрнатароў, гэнэрал-губэрнатароў и др.) каторая, кали абъяўляецца „усилённая“ ци „чрэзвычайная ахрана“, робиць так, як хочэ, на гледзячы на ўсе законы.

Изноў ка дэты заявили, што кали ўвядуць ўсе новые парадки и свабоды, што абецали ў Манифэсци 17 акцябра, кали будуць строга трымацца законоў, кали будзе администрация адвечать перад судом за сваи паступки, кали адменяць „надзвычайную и усиленую ахрану“,—тагды ў гасударстве будзе здаровае жыцьцё, будуць шанаваць законы, и скончыцца непарадак и безпраўе, што цяпер пануюць ў Расеи.

Ўспомнили на гэтым заседаньню и аб Беларуси. Дэп. *Замыслоуски* (правы, ад Виленск. г.) сказаў, што тут ешчэ ёсць шмат „польских интрыг“, и дзеля таго ня можна даваць Беларуси земскаго самоупраўленьня, бо ўсе нации на выбарах будуць сварыцца. —Дэп. *Монтвилл* (паляк, ад Вильни) адказаў, што у нас ўсе нации доўга жывуць разам и не сварацца. Чыноўники ў „северозападным краю“ маюць надта вяликую силу и нават ня выпаўнили Царскаго указа аб выбарах маршалкоў шляхты. Край наш тольки тады падымецца, кали дадуць земскае самоупраўленьне, ўсим роўные правы и адменяць асобные законы, што заведзены тольки для гэтаго краю.

* *
*

*57-ае заседаньне.* Зацьвярдзили саўсим закон аб числе новабранцоў.

* *
*

*58-ае заседаньне.* Даваў атказ вострты таварыш министра ўнутрэных дзел, Макароў, ўсим араторам, што нападали на министэрства. Яму изноў дэпутаты востра атказывали. — Дэп. *Тычынин* (ад гродзенск. губ., правы), завёў доўгую гутарку пра польские и ксяндзоўские „интрыги“. Другие дэпутаты крычали яму: „досыць!,“ а ён усё гаварыў, чытаў неякие листы, напрыклад ад чыноўникоў губэрнскаго праўленьня, ад палицэйских; ў гэтых листах яны жаляцца д. Тычынину, што им мала плацяць.—Кс. *Мацеевич* (ад Вил.)гаварыў пра крыўды, каторые церпяць ад правицельства каталики и ксяндзы.

Д. *Сагатэлян*, гаварыў ад армян на Каўказе и жалиўся на администрацию каўказскую.—Д. *Тэвкелев* — гаварыў аб абидзе магаметаноў (татар).

Гэтае заседаньне было 1 мая (1 мая святкуець працавитая бедната ўсяго сьвету) и дэпутаты социал-дэмократы прышли с чырвоными кветками на грудзях.

* *
*

*59-ае и 60-ае заседаньня.* Атказывали изноў на мову таварыша министра Макарова дэпутаты *Маклаков* и *Аджэмов* (з партии народнай свабоды) и ад палякоў дэп. Дмовски.

* *
*

*61-ае заседаньне.* Разгледали далей расходы на министэрства ўнутрэных дзел. Левые казали, што трэба адмяниць цэнзурные камитэты, бо цяпер павинна быць свабода друку.

* *
*

*62-ое заседаньне.* „Правые“ зрабили запрос правицельству пра Финляндию. (Финляндия ляжыць меж Пецербургом и Швэдами. Гэты край маець поўнае самоупраўленьне и сваю Думу—Сэйм. Людзи там маюць усе правы и свабоды; и край гэты мае добрае устройства, и людзи жывуць багацей, як у Расеи.)

Прадседацель савета министроў *Столыпин* адказываў на гэты запрос „правых“, што правицельства нездаволена Финляндией, бо там многа рэволюцыйнага духу. Напрыклад, ёсць саюз „Войма“ (Сила). Гэты саюз робиць дружыны, дае им аружжэ. А финлядски сэнат пастанавиў, што закрываць гэты саюз нима за што, бо ён мае мэту не скидаць парадки и законы, якие цяпер ёсць ў Финлядии, а хочэ утрымаць их и абараниць, каб их не адабрали. Расейскае правицельства ня хочэ, каб быў гэты саюз. Апроч таго руские рэволюционеры ездзяць у Финляндию, и там им нихто не прашкаджае рабиць сабраньня. Финлядия так сама часам выдае для сябе законы, каторые правицельству не угодны.

## Работы зьезду коопэрацыйных товарыств у Маскве.

Ў № 9 «Нашае Нивы» мы ўжо писали, што ў Маскве 17 апрыля сабралися на зьезд выбарные ад коопэрацыйных товарыств з усяе Расеи. Таких выбарных было близка 800, а кали паличым ешчэ гасьцей, што были на зьездзи, дык ўсяго набярэцца больш за паўтары тысячы людзей.

На першым агульным сабранни ўсих зьехаўшыхся прэдставицелёў суполок прачытаў вельми цикавы „даклад“ аб коопэрациях за границаю В. Тотомиянц.

За границаю,—казаў ён,—коопэрацыйные товарыства перш за ўсих пачали закладаць работники, каб лягчей было змагацца з фабрыкантами. За фабрычными рабочыми пайшли и мужыки. Товарыства гэтакие ставили сабе уселякие мэты; ўсё-ж таки ўсюды найбольш заводзяцца такие суполки, што адкрываюць для супольникоў свае крамы, ў каторых тые ўсё дастаюць танней. Да „коопэраций“ належыць за границаю вельми многа народу. Напрыклад, у Англии ёсць ужо больш як поўтрецяя мильёна (2.500,000) людзей — членоў кооперацыйных товарыств. Суполок там цяпер больш за поўтары тысячы, ды ўсё прыбываюць новые. Грошми абароту ў них было каля 630 мильёноў руб., а даходу за апошни год мели яны 10 мильёноў руб. И гэты даход коопэрацыйные товарыства аддаюць на школы, библиотеки, чытальни, на выданьне газэт и на иншые надобные рэчы, ад каторых будзе карысць усяму народу. Ў Англии ёсць коопэрацыйны банк, каторы вялика грамада людзей аткрыла супольне, зложыўшы на гэта кожны па крысе грошей; гэты банк дае пазычки рабочым за малые працэнты—па 3½ (поўчварта) рубля з сотни, а па иншых банках бяруць ня менш, як па 7 працэнтоў, значиць, у два разы больш. Заведзены ешчэ супольные фабрыки; ў их працуе близка 40 тысяч рабочых, дый праца их лягчэйша, як ингдзе: яны працуюць па 8 гадзин ў дзень.—Па иншых краёх коопэрации растуць з году ў год. У Швэйцарыи пятая часьцина жыцелёў належыць да коопэрацыйных суполок, ў Немецчыне—палова селян-мужыкоў. Ў Бэльгии товарыства гэтые добра шырацца; их заводзяць там найбольш социалисты. Ў Италии мужыки па вёсках маюць свае супольные банки, кассы, товарыства для аренды грамадою зямли у паноў; члены гэтых товарыств ня тольки супольне арендуюць зямлю, але ўсе разам, хаўрусом працуюць на ёй, и меж ими ёсць шмат мужыкоў беззямельных; а ешчэ италийские рабочые, што працуюць у шкляных гутах, завяли нядаўно чатыры свае супольные гуты и робяць конкурэнцию сваим даўнейшым гаспадаром—багачом-фабрыкантом.

Пасьля мовы Тотомиянца гаварыў В. Поссэ аб коопэрациях ў Расеи. Разсказаў ён пра той завод на Урале (каля Екатэрынбурга), што ад казны перайшоў ў руки самых работникоў; хаця казна хацела яго саўсим закрыць, бо ня мела даходу, але-ж цяпер, як гаспадараць рабочые, ён трымаецца вельми добра. Казаў Поссэ, што для нашых селян коопэрации надта карыстны: нима ведама, ци дадуць кали зямлицы, дык не чакаючы варта ўсим разам трымацца и вырабляць зямлю супольне—будзе лягчэй жыць.

На першым заседаньни зьезд падзелиў сабраўшыхся на часьци — „сэкции“ и кожнай назначыў сваю работу. Працавали кольки дзён, але-ж ўсяго, што пачали ня скончыли: палиция закрыла зьезд.

## ПЕСЬНЯР.

Кажуць людзи: „Што ты смутны?  
„Што сьпеваеш ўсё пра горэ?  
„Твае песьни—стогн пакутны,  
„Сьлёзы ветра на прасторы!

„Ты злажы нам песьню воли,  
„Песьняй шчасьця заливайся!  
„Цихим сьпевам нивы ў поли  
„Ў струнах сэрца адкликайся,

„Каб вясна на нас дыхала,  
„Грэла душу цеплатою, —  
„Каб нам сэрцэ сагрэвала  
„Цихим шчасьцем, дабратою“. . . .

— Ой, вы, людзи! Нима-ж воли:  
Скуты мысьли ланцугами,  
Пусты нивы нашы ў поли,  
Злосны вихар дзьме над нами!

Ци-ж я сэрцэм не балею?  
Ци-ж мне смутак лёгка даўся?! . . .  
Я сьпеваю, як умею, —  
Я пра радасць пець ня здаўся! . . .

Якуб Колас.

# Торф у сельскай гаспадарцы.

На низких мейсцох, гдзе застаиваецца вада, у нас шмат торфянишч. Яны робяцца гэтак: мох-торфяник, што там расьце прагнивае и апушчаецца ў зямлю; на им нарастае новы мох и так сама апушчаецца ў низ; гэтак робицца з году ў год, и ў зямли залягаюць пласты прагниўшаго моху, каторы и называецца торфам. У им пападаюцца и трава, асака, лисьци дзярэў. Ўсё гэта ляжыць сотнями, тысячами гадоў. — Самы низ найбольш прагнивае и прэе, ды робицца як-бы чорнае ци бурае цеста; гэта и ёсць той самы торф, што идзе на апал (—як яго выробляць на апал, напишем пазьней). Але ужываюць яго и на другие рэчы.

Гэты торф, што як цеста, здатны для гнаеньня поля. Тольки вывазиць яго проста на поле нельга: трэба, каб ён перш выветрыўся и струхлеў. На тое ў восень яго рэжуць у цэглы и складаюць на сухим мейсцу, як сажени дроў, тольки ешчэ вышэй; палежаўшы два, тры або чатыры годы торф гэты пачынае сыпацца, як парашок, непатребные квасы вымываюцца вадою и вымерзаюць, и тагды можна вазиць яго у хлеў ды падсцилаць жывёлу. Накладаюць яго вяршки на чатыры, а зверху накидаецца салома. Як скацина добра утопчэ и згноиць торф, то праз нядзели дзьве можна выкидаць з хлева ў кучу, а гдзе нима моды выкидаць гной з хлявоў, там насцилаюць новы пласт торфянога парашку и саломы. Пазьней им и гнояць поле. — Лепшы торф на поле гэта з ситника и асаки.

Каб гнаиць поле тым торфам, што як цеста и што идзе на апал, можна и абминуць хлеў, и таду треба на двары рабиць компостные ямы ци кучы. Яму капаюць аршыны на два глыбины и шырыни, а даўжыни—як выгадней. Добра гэту яму выкапаць пры самым спадзе з хлявоў, каб туды сцекала гнаёўка. На дно кладзецца грубы пласт торфу. Ў яму сыпецца ўселякае сьмецьцё, попел, сажа,—выливаюцца памыи. Ад часу да часу перекапываюць усё гэта и дакладаюць новаго торфу. Як усё скрозь стане роўна чорна- як чорназём, гэты гной вязуць на поле.—Замест ямы можна рабиць компост у кучах; тады трэба кучы перакапываць, прабиваць ў их калом дзиры и туды лиць памыи, гнаёўку.

Але-ж лепшая падсьцилка и лепшы гной будзе не з гэтаго торфу, што як цеста и ляжыць на самым сподзе, а з верхних пластоў торфянишча, гдзе торф не так ешчэ перапрэў. Кали ўзяць гэтки торф ў руки, то ён, як мох, ня пэцкае рук. Ен больш жоўты, и з яго можна выциснуць ваду, як з губки. Гарыць ён не цикава, и як капаюць торф на апал, то верхние пласты скидаюць на бок.

На торфянишчы, гдзе хочуць нарэзаць гэтаго торфу-моху, капаюць неглыбоки равок, каб асушиць трохи балота; тады вострай ценкай лапаткай з простым, а не круглым канцом рэжуць акуратне рад за радам цэглы. Цэглы гэтые складаюць на сухим мейсцы у клетки, каб торф добра прасох. Цэглы доўжыни 10—13 цалей, шырыни 4—6 ц., грубини 3—4½ цали. Такие ўжо сухие кавалки торфу-моху звозяцца да дому и кладуць пад стрэху, каб не замокли. Гэтые цэглы торфу-моху прад тым, як падсцилаць у хлеў, трэба канечне разбиць у дрэбязу; вось их и прапускаюць ци праз сечкарню, ци праз корнерэзку, ци штыфтовую малатарню, бо скацина не заўсягды може цэглы разбиць нагами. Для гэтаго ёсць и асобные машыны. Кали-ж астануцца непабитые кавалки и их вывязуць на поле, то яны так и астануцца и будуць шкодзиць полю.

Трэба стольки разбиваць цэгел, кольки трэба на падсцилку на адзин раз. Падсцилка з гэтаго торфу надта цягне ў сябе макрату, и лепш торф трымаць на памосци з досак пад стрэхай, каб сыпаць ў хлеў сухи.

Карысць с торфо-моховой падсцилки вось якая. Торфу менш выходзиць, як саломы, больш гною и добраго збираецца, не прападае рэдки кал, каторы лепшы ад сухога, у хлявох будзе и чысцей, и сушэй, ды нима смуроду.

Торф-мох моцна ўцягивае ў сябе ваду. Пуд саломы можэ ўцягнуць $2^{1}/_{2}$ пуда вады, а пуд торфу моху—ад 8 да 14 пудоў вады. На адну карову саламяной падсцилки трэба на год 250 пуд., а торфо-моховой—78 пудоў; для каня 120 пуд. саломы, а торфу—38 пуд., для сьвини 14 пудоў саломы, а торфу—8 пуд. Карова (добрая) даець цьвёрдаго калу ў год 500 пудоў, ў гэтым кале будзе 428 пуд. вады; а рэдкаго калу карова даець ў год 628 пудоў. Дык вось, каб усё гэта рэдкае не прападала, трэба у хлеў сыпаць мохо-торфяны парашок: ён (кали яго досыць сыпаць) може ўцягнуць и трымаць ў сябе ўсю гнаёўку, и яна не прападае. Пры нашых рахунках, торфу прыходзицца ў дзень на 1 карову $8^{1}/_{2}$ фунтоў, на каня— $3^{1}/_{3}$ фун., на сьвиню—1 фунт.—У хлявох заўсягды бывае цяжки дух ад калу, ён аж рэжэць вочы — гэта выходзиць аммияк ци аммонияк (таки газ); гэты аммияк канечне патрэбны для раслин и для поля. Вось торф ўцягивае ў сябе и той газ, и ён не прападаець, дый скацине здаравей ад чыстасьци.

Торфу першы раз пасцилаюц у хлеў па 1 ци $1^{1}/_{2}$ пуда на галаву, а потым што-дзень падкидаюць па фунты тры туды, гдзе ўжо мокра. Кали ўвесь гной макраваты, то треба перавярнуць яго и пасыпаць новы пласт торфу; можна падкидаць и саломы. Некаторые радзяць не трымаць гною у хлеви больш 1—2 нядзель; потым кажуць выкидаць ў кучу (як гэта заўсягды робицца ў лепших гаспадарках)...

Кубичная сажень сухих цэгел торфу-моху важыць ад 40 да 60 пудоў. Вырабиць 1 пуд каштуе 5—6 кап.

Книги аб торфовай подсцилцы ёсць такие:

1) Торфо-моховая подстилка. П. М. Соловьева изд. Девриена ц. 40 коп.

2) Torf i jego zastosowanie w rolnictwie. W. Kotłubaj. c 1 rub.

3) Torf, jego pochodzenie i pożytek w gospodarstwie włościańskim. W. Kotłubaj. c. 10 kop.

Хто хочаць дастаць прэйс-курант аб машынах для торфу, нехай напишэ адкрытки, адрэсуючы:

1) Рига. Заводъ Фельзера и К-о.
2) Вильна. Склад машин. З. Нагродзкаго.
3) Варшава Alfred Grodzki. Senatorska, 33.
4) Влоцлавск, Варш. г. фабрика Mihsama.

**Гаспадар.**

## На вясельле!

(Апаведаньне старога дзеда).

Было мне гадоў шаснаццаць. Помню, як сягоньня, часьценька у свята мы тралявалися *) ў

*) цягнулися.

Барысоў на кирмаш — бывала, сам я адзин, — бывала, с сястрой Пятрунэлей, а яна тады была дзяўчынай. Ў Барысови заўсягды спатыкали мы дзязьку нашаго, а то часьцей цётку; вось яны, абы тольки сустрэўся, зараз пачынаюць пытацца, што чутно и ци скора Пятрунэлю замуж аддаваць будзем. — Мне гэтае пытаньне так абрыдла, так далося ў косьци, што стаў я мяркаваць, як адвучыць их ад яго.

Здарылося неяк, што я загуляў у Барысови з хлопцами; покуль тое ды сёе, дык и цёмна стала, а тут ешчэ, як на безгалоўе, дождж лупянуў таки, што як з лубу лье. Хецеў перш исьци да дому, але, аднаму неяк было боязна, дый далёка— вёрст 8 па дажджы цёпкацца. Дай думаю, пойду да дзядзькоў и папрашу их на вясельле! — Пэўне пойдуць!

Падыхожу пад хату и ляпаю у вакно. Яны ўжо спали. Чую, крэхчучы лезе дзядька з печы: „Хто там?“ -- пытае. — „Я!“ — „Чаму-ж гэтак позна?“—„А вось татка и мамка на ўсё прасили, каб вы на Пятрунэлинс вясельле канешне прышли“.—„Чы ты здурэў?“—изноў кажэ дзядзька,— „па ночы и ў гэткую пару?“ — А я давай лгаць, што пакуль па дарози зайшоў да аднаго, да другога, то хоць и вышаў з хаты да-сьвету, але да дзядзьки крыху спазьниўся.

Дзядзька верыў и ня верыў, але, як чалавек гасьцинны, ўсё-же таки зьвярнуўся да цётки и кажэ: „Пойдзем, ци што?“ — „Хиба пойдзем“ — атказала тая.—„Ну, дык зьбирайся!“

Зачали варушыцца. Дзядзька з сьвирну прынёс булку хлеба, закинуў за плечы, зачапиў люльку ў зубы, а цётка падкасалася ў дарогу, и павалаклися па дажджы ды па балоци.

Я ишоў шляхам памеж бярозак — ад смеху чуць не валяюся!

Ишли мы гадзины са дзьве. Змокли да нитки. Вось падышли и пад нашу вёску.

Цёмна, хоць пальцам у вока пары. Сабаки выюць. Вось наша хата. — Я схаваўся за гумно и паглядаю, што гэта будзе.

— „Што за хвароба,“ — бурчыць дзядзька, — „чаму гэта ў хаци цёмна? Ци яны ўжо па вясельли, што спаць паклалися?“—А цётка як мыла зьеўшы: „можэ и паклалися,— ведама, маладые, дык пасьпяшылися трохи“. - „Ну, годзе гаманиць! Стукай, бо я чуць жывы!“

Тольки цётка пачала барабаниць, — атклыкаюцца з хаты: „Хто там?“ — „Мы!“ — „Хто мы?“ — „Ды-ж мы на вясельле прыйшли!“—„Якое вясельле, хто вас кликаў?! Ци не Сымонка, каб ён прапаў?!“ — „Але-ж, ён.“ — „Зманиў, каб ён затануў! Скарэй у хату идзеце!“

А дождж лье, як з лубу.

Я пайшоў сабе ў еўню и выспаўся добра аж да раньня. З таго часу ни цётка, ни дзядзька николи больш не пыталися, кали вясельле Пятрунэли!

**Сымонка.**

## АСЁЛ И НАВУКА.

(Байка).

Аслова нявуцтва не раз
Служыла дурнём за паказ; —
Дык вось нарэшце узяли
Асла ў навуку аддали.
Стали вучыць яго чытаць, —
Вучыли нават и писаць.
Асёл так шчыра ўчыцца ўмеў,
Што книжки ўсе, як сена, зьеў
И стольки ў гэтым скарыстаў,
Што горш убоистым ён стаў!...

Людзём ёсць тут таки прымер
(Есць людзи на быдля манер):
Хоць кольки ни вучы асла,
Аслом ён будзе да канца!...

**И. Л.**

# З Беларуси и Литвы.

(Ад наших карэспандэнтоў).

З **Гродзеншчыны.** У нашай губэрни мужыки магли бы шмат скарыстаць с торфу и для гноеньня поля, и для апалу. А тым часам на бяду яны ешчэ не напрактыкавалися жыць сваим розумом и чакаюць нима ведама чаго, а гаспадарка марнеець. Земля у нас наиболып наносная—песчаная и супесчая, камянистая. Але ва ўсих паветах ёсць торф. Торфовые балота бываюць у $1^{1}/_{2}$—3 сажэни глубины, пад сподам залягаець часам балотная жалезная руда.

**Халимон с-пад Пушчы.**

З **Бельскаго павету** Гродз. губ. Па наших вёсках хваробы звили сабе моцнае гнездо. У аднэй вёсцы Клениках за апошни месяц ад шкарлятыны памёрла 50 дзетак!... Мужыки капаюць, ўсё капаюць сваим дзецям ямки на могилках; ў кожнай хаци мруць дзетки часта па двое и па трое. И на магилках памеж старых пахиленых и абросшых мохам крыжоў растуць новые маленькие крыжыки —ўсё новые.. Навука кажэ, што ў Расейским гасударстви дзеци мруць больш, як па других царствах. А у нас у Беларуси ешчэ горш, як гдзе, и нима ни аткуль ниякой помачы. Кали и прыдзе яна кались, дык да тае пары смерць забярэ ў магилу кольки сотняў дзяцей. И цяпер, кали з вясною ўсё на зямли ажывае, кали сонцэ пачынае ласкавей глядзець,—маленькае жыцьце замирае... А то-ж з гэтых дзетак многа было-бы карыстных работникоў,—можэ и вяликих людзей. Кали-б было у нас земства, дык тады были бы земские бальницы, дактары; але-ж „правые“ духоўные Гродзенскай губэрни пасылали дэпутатоў сваих ў Пецербург дабивацца таго, каб у нас саўсим не завадзили земства, бо туды, бач, пападзе шмат палякоў-каталикоў, а нашы гэтаго ня хочуць (глязи „Телеграфъ“ за 1907 г. „Протоколы выборовъ по Грод. губ.“ и „Епархіальныя Вѣдомости“). Нашаму беларусу-мужыку астаецца адзин тольки той „вецер непрытульны—родны брат ў доли“....

**Михалка-Запалка.**

**Минск.** У Серэбранцы каля 70 арэндароў ад 1 мая ужо пачали выкупаць арэндную зямлю ад гаспадара яе, Любанскаго.—З архирэйскай и цэркоўнай зямлёй ешчэ ничога не чутно—ўсё робицца па стараму. Нядаўно диякон сабора сьвяшч. Рабцэвич хацеў выселиць арэндатора Юрскаго, што сядзеў многа гадоў на цэркоўнай зямли. Але-ж Юрски не паддаецца и ў тых днях быў нават у Цара са скаргай. Яму, як кажуць, абецали памагчы ў яго бядзе.

**Минск.** З нашае губэрни многа народу выселяецца ў Сыбир. 17 апрыля з Бабруйскаго павету выехала 110 мужыкоў, каторым нельга ўжо было жыць у сваей старане. Шмат людзей выежджае з Барысоўскаго и Игуменскаго пав. Якую апеку маюць нашы пераселенцы, видаць ужо с таго, што ў Барысови 116 сямей мужыцких з гэтых двух паветоў мусили чакаць пад голым небам дзьве нядзели, покуль им дадуць поезд. А грошэй у их, ведама, нима, дый ешчэ апошняе прышлося тут чакаючы праесьци.

= Тутэйшые цэгельни, як кажуць, хочуць зрабиць хэўрус („сындыкат“), каб згаварыцца меж сабой, якую цэну назначыць за цэглы, каб адна аднэй не рабила конкурэнции.

= У Минску незабарам будуць выбары новаго дэпутата заместа Шмида, катораго сама Дума не прызнала дэпутатам за тое, што кались немцом Расею прадаваў за грошы. Тые „прыяцели“ народу, што ўгаварыли мужыком падаваць голасы за Шмида, будуць мусиць и цяпер старацца, каб ў дэпутаты папаў изноў хто-небудзь з ихняе хэўры. Цикавая рэч, ци мужыцкие выбаршчыки паслухаюць их пасьля справы Шмида, каторы прайшоў ў Думу тольки дзякуючы мужыком.

= Ў Минскай губ. выбираюць мейсца, гдзе аткрыць новые народные школы. З казны на новые школы па пастанаўленьню Думы будзе прыбаўка, дык у Миншчыне на кожную новую школу маюць даваць па 390 руб. ў год, а што трэба болей, гэта мусяць даць земства и сельские обчэства. У дырэкцию прысылаюць вельми многа мужыцких прыгавороў аб аткрыццю школ, але-ж беда, што мужыки ня могуць ўсюды даць стольки грошэй, кольки прыходзицца дакладаць да казённай асыгноўки.

= Суд апраўдаў 15 арэштантоў, каторых судзили за тое, што хацели уцячы з турмы.

= 30 апрыля а 5 гадзини раницы на игуменским тракци пад Минскам (каля архирэйскай дачы) на балагульшчыкоў напали разбойники и пачали стрэляць ў их. Паранили дзьве кабеты и аднаго зношчыка. Тады стали грабиць дабро и забираць ад пасажыроў грошы. Але-ж ў тым часи падъехаў други абоз балагульшчыкоў, у каторых были рэвольвэры ды ешчэ якое аружжэ. Убачыўшы гэта, разбойники пакинули ўсё и уцякли.

Ў в. **Тарасово** Минск. губ. и пав. забаставали работники, што працавали ў тартаку (лесапильным заводзи). Палиция арэштавала 14 чалавек (усё мужыки тутэйшые), але зараз-жэ 11 выпусьцили, а трох паслали ў Минск у турму.

**У Бабруйску** Минск. губ. тры неякие людзи хацели абабраць купца и пры гэтым забили гарадавога ды зранили двух людзей.

**М. Койданово** Минск. губ. Тут у восени мае аткрыцца гарадзкое вучылишчэ, ў каторае будуць прымаць вучнёў без розницы рэлигии, нации и саслоўя, а пазьней можэ пачнуць прымаць ня тольки хлапцоў, але и дзяўчынак. За вучэньне ад койданоўских мешчан пастаноўлена браць па 25 руб. за год, а ад усих иншых вучнёў—па 40 руб. Кажуць, што як вучылишчэ аткрыецца, тады завядуць наву ку францускай и немецкай мовы.

З м. **Снов** Минск. г. Новагруд. п. ў „Минск. Кур.“ пишуць пра цяжкае жыцьце батракоў ў маёнтках вяликих паноў.

Многа працы и поту кладуць работники, каб павел ичыць багацтва и даходы маёнткоў. А жывуць парабки — гэтая рабочая скацина ў цесных пекарнях, часам па 2 сямьи ў вадной, у грази и задуси; харчы им дастаюцца слабые.

Хатковые, сямейные бяруць 35—40 руб. ў год, дастаюць ордынарыю невяличкую, трымаюць, кали панская ласка, карову и са 2 грады агароду. Як парабок жывицца, нима ведама. Часам парабки калечацца машынами, и тагды астаюцца саўсим без кавалка хлеба.

**М. Тургели** Виленск. г. и павету. Нашаму старасьвецкаму мястэчку, каторае жыве з зямли, нима чым пахвалицца. На малое мястэчка пивных залишне многа—цэлых 8 штук, а „рэстараноў“ 2. Есць вялики касьцёл, ёсць и вучылишчэ. Крыху карысьци зимой людзи мели з таго, што вучыцель паказваў „туманные карцинки“ и чытаў аб усём па троху, аб хваробах, аб гаспадарцы—часам па 2—3 разы ў нядзелю. Хаця тут беларусы ўсе каталики, але з ахвотай хадзили на тые чытаньня —и дзяцей пасылали вучыцца да школы, дый ксёндз быў прыхильны да гэтаго: ён абъясняў, што лепш хадзиць на чытаньня, як у рэстаран. З вучыцелем мужыки добра жывуць, бо видзяць, што ён стараецца зрабиць якую карысць мужыкам и роўна шануе ўсе нации и веры. А раней мужыки не любили школы, и там вучылося тольки 4—6 хлапцоў. — Новы вучыцель заводзиць садзик и „школку“ яблонь и грушэк. Вёсковая интэлигенция, кали захочэць, многа можэ зрабиць для прасьветы народу, як робиць той вучыцель. **Севец.**

**Г. Радашковичы** Виленск. г. Вилейск. пав.: У нас ешчэ зимой быў сход ў воласьци. Быў земски и некаторые памешчыки. Гаварыли, што можэ быць халера, а можэ и ня быць. Дык усёж трэба настроиць так, каб, кали (барани Божэ) будзе халера, лягчэй было ваеваць проци гэтай хваробы. Значыць, трэба прыгатаваць грошы на лекарства, на санитароў, ды трэба, каб была чыстасць. Але нашы беларусы никому ня верацъ; часам гэта добра, а часам и ня добра. Цяпер дык гэта было ня добра: яны не хацели даць грошэй и не падписали прыгавору.

Беларус надта баицца падписываць бумаги; напрыклад, пасьля сходу мужыки цэлы тыдзень не падписывали ниякой бумаги. Некаторые казали: „а можэ гэта бумага з Думы, каб мы падписалися, што нам зямли ня трэба!“ Кожны разумее, што такой бумаги Дума ня можэ прыслаць; найлепш, каб хто, каму мужыки верацъ, прачытаў мужыком бумагу и вытлумачыў добра.

Ў народным вучылишчы вучыцель Рак, катораму мужыки верацъ прачытаў аб халеры, што гэта за хвароба и як ад яе абараняцца. Усе добра зразумели. Трэба было-б, каб часьцей чытали такие рэчы ў школах, тагды-б и народ лепш усё разумеў. Пра халеру мужыки гутараць так; „мне ўсё роўна, ци памираць з голаду, ци ад халеры“. —А ешчэ кажуць, каб была чыстасць,—дык у нас ўсюды чыста, дзякаваць Богу: и ў гумне, и ў клеци, и ў хлеви! саломину, сена, зерне мы ўжо ўсё паели, ды ўжо з хлявоў и скацинку вядзем на торг!“

Хоць мужыку и цяжка жывецца, а ўсё-ж мы радзим, каб зрабиць што можна, проциў халеры. З гэтай хваробай жартоў нима. **Клешня.**

**Г. Радашковичы** Виленск. г. Вёски каля нас жывуць не цикава, але не уважаючы на гэта ў гарэлцы не трымаюць меры. У нас беларус кали нарэжэцца, дык як быдла. Польские мужыки пьюць куды менш за беларусаў. Аднаму маему знаёма-

му даводзилося быць ў польским мястэчку, дык там дужэ пьянога чалавека спаткаць можна рэдка. Пьюць ў меру!

Адкуль беларус бярэ грошы на гарэлку? Адзин чалавек з в. Галавачы прышоў да аднаго чыноўника и кажэ: „я прывязу летам новаго сена пудоў 30, дык дайце мне грошы 4 р. 50 к., трэба купиць хлеба и сабе кашулю“. Той даў грошы. Але праз гадзину гэты чалавек ужо качаўся на вулицы,—нажлухциўся гарэлки...

**Юзя Шчупак.**

Ў в. **Сыцэвичы** Радашкоўск. вол. Прыехаў ня даўна быўшы пачтыльён Кулина да свайго бацьки. Ен жыў па других краёх Расеи и бачыў, як там правяць сенажаци каля рэк; вось захацеў ён паказаць сваим сябром, як паправиць сенажаци, што лежаць пры рэчцы Вязанцы. На сходзи ён тлумачыў, што Вязанка абмялела и сенакос сухи, дык трэба парабиць заставы с каменёў, ци як, каб падняць ваду на той час, покуль трава расьце, а перад касьбой трэба воду панизиць. Але людзи яго не паслухали; а добрую раду варта абдумаць и паслухаць яе. Нехай сычэўцы купяць книжки аб гэтым. **К.**

Г. **Дзисна** Вил. губ. Ў нашым маленьким вуездным горадзи завяли ткацкую школу—варстат, гдзе дарма вучаць вёсковых дзяўчын ткаць дываны, палатно и другие рэчы на новых кроснах—самолётах. Министэрства сельскай гаспадарки дало адзин станок для дываноў и два для палатна, дзисненская каталицкая дабрачынная суполка—2 станки, п. Пацэвич — 1 станок, п. Пашкевич — 1 ст. и пани Снарская—цэлых 5 станкоў, бо министэрства трэбавала, каб было 12 кросен-самолётоў. Министэрства прыслала вучыцельку А. Д. Пахолкову, катора добра вучыць ткаць на розные дэсэни, а так сама вучыць плясьци карунки; казна ёй пэнсию плациць, а тут тольки даюць ёй кватэру. Трэба цешыцца, што у нас людзи не спяць. Была бы тольки цьвёрдая воля и звычай дабивацца ня гледзючы ни на што сваей мэты, а заўсягды знойдуцца людзи, што потым пристануць да суполки и памогуць. Найчасьцей кожны кажэ, што ничога ня ведае и ня хочэ ведаць,—„мая хата з краю!“

Прад аткрыцем школы прыезджаў „инструктор“, каторы навучаў дарма ўсих, хто хочэ, як разводзиць и вырабляць добры лён.

= Ў нас каля Дзисны цяпер парабилися малочные суполки, бьюць цэнтрафугами масла и пасылаюць проста ў Лондон (па 17—18 руб. за пуд). Адзин паставиў нават паравую цэнтрафугу и выбивае па некольки пудоў масла ў дзень. Мужыки прадаюць свае малако для гэтых фабрык па 10—12 к. гарнец. **Новы.**

## ПЕСЬНЯ.

За сахой, бараной,
За сярпом и касой
З дня на дзень, з году ў год
Сьлёзы, пот лье народ,
А за гэта за ўсё
Што-ж дабыў за жыцьцё?
Гэй, го-го! Гэй, го-го!
Мы жывём и пяём,
Хлеб наш людзи ядуць,
Мы-ж мякину жуём!..
С тапаром и пилой
Маразянай зимой
З дня на дзень, з году ў год
Шурки ставиць народ,
А за гэта за ўсё
Што дабыў за жыцьцё?
Гэй, го-го! Гэй, го-го!
Мы жывём и пяём,
Агрэваем других,
Самы холад клянём....
На палац, на пакой
На сьпине, на худой
З дня на дзень, з году ў год
Бэльки носиць народ,
А за гэта за ўсё
Што здабыў за жыцьцё?
Гэй, го-го! Гэй, го-го!
Мы жывём и пяём,
Домы ставим людзём,
Самы мрэм пад вуглом....

Янук Купала.

## З усих старон.

**Екатэрынослаў.** 29 апрыля а 12 гадзине ў дзень на дзядзинцы турмы арэштант Нагорны кинуў пад сьцену бомбу, каторая крыху зруйнавала сьцену. У той самы момэнт некольки арэштантоў, што были на двары, пачали уцякаць з турмы; ў их тады стали стрэляць салдаты, што пильнавали турму. Як другие арэштанты, што были ў камэрах, пачули гром бомбы, яны кинулися к вокнам глядзець, што зрабилося. Караульные пачали стрэляць и ў их. Усяго с-памэж арэштантоў забили на мейсцу 29 чалавек, а 30 зранили — некольки цяжка. Два трупы знайшли аж на стрэси. Ў турме зрабили обыск и у аднэй камэры аткрыли ешчэ дзьве бомбы. — Меж забитыми и зранеными многа вучашчыхся, ды ўсё гэта маладзёж.

**Бяздольны.**

**Севастополь.** Генэрал-губэрнатор Вирэн аштрафаваў на 3 тысячы руб. прысяжнаго заседацеля Гидалевича за тое, што ён казаў конвойнаму салдату ня биць арэштанта. Конвойны гаварыў, што бье за тое што арэштант сьпеваў „марсэльезу“. „Евр. Изв.“

Ў **Воронежы** неякая кабета кинула бомбу ў губэрнатора, але не забила яго. Яе арэштавали. На дапроси яна не захацела ничога гаварыць и не сказала, хто яна. На-

лежыць яна да партии социалистоў-рэволюционэроў. „С.-Зап. Гол.“

**Киеу**. Тут ў турме сядзиць начальник тайнай палиции, Асланов. Винавацяць яго ў тым, што ён на судзе фальшыва прысягаў, каб абараниць вядомаго ўсим злодзея так-званаго „Цылиндра“ або „Караля злодзеёў“. А ешчэ камисия, што рэвизуе яго справы, стараецца давесьци, ци праўда, што Асланов сам нарыхтаваў зладзейскую хэўру, катарая праз некольки месяцоў абкрадала ўвесь горад, не баючыся никога. „Кіевск. Вѣстн.“

У **Одэсси** ў турме ночыю 24 апрыля палитычная арэштованая Елена Смирнова аблила сябе газай и запалилася. Покуль прыбегли надзирацели, яна так абгарэла, што адратаваць яе не удалося, и яна памерла. „О. Н.“

## Вясенняя пара.

Сонцэ, пагода, —
Ласка и згода;
Дзень ясны, милы, —
Здароўя, силы;
Сьпеў птушэк ў поли, —
Думки аб воли;
Ветрык чуць вее, —
Миласць, надзеи;
Квят, зелянина, —
Всёлая мина;
Праца да поту, —
Радасць, ахвота;
Песьня и эха, —
Шчасьце, пацела. . . .
— Во чары вясны!
Ци-ж доўга яны? . . .

**Альбэрт Пав—ич.**

## ПАЧТОВАЯ СКРЫНКА.

**Францыя. Ницца. Т. Г.** „Дым“ добры для книжки, задоўги для „Н. Н“.

**Ивенец. Мин. г. и у. Васильку:** „За што крыўдзице“ беларусаў не падходзиць к момэнту.

**Радашковичы Вил. г. Юзе Шчупаку;** не бядуйце, што не друкуем вашы вершы: думки ў их мудрые, рытм ешчэ храмаець. Практыкуйцеся.

**Минск. Галубку:** Рытм!?

**Хотаевичы Минск. г. Борис. у Тэйсингасу:** У Хотаевичах адкрыли ў 1907 г. касьцёл; каталики рады; але кали хто з праваслаўных пераходзиць да каталикоў, бьюць у звоны! Каму гэта шкодзиць? Рэлигия—гэта справа суменьня. Кали хто чысты перад сваим суменьнем, той не павинен баяцца званоў. Кожны робиць свае.

**Ильинск Вил. губ. Янцэ Тутэйшаму:** Землеустраицельная камисия ня хочэ памагчы бедным мужыком купиць зямли! Што-ж рэдакция можэ зрабиць?!..

## ВЫДАННЯ „НАШАЕ НИВЫ.“

**№№ 1 и 2 Зямельная справа у Новай Зэляндии.** (Польскими и рускими литэрами). Пераложэна з украинскай мовы. Ц. па 3 к.

**№№ 3 и 4 „Гэдали“** апаведаньне **Э. Ожэшковой,** з рысунками **Богуш-Сестжэнцевича.** (Пол. и руск. литэрами). Цэна па 6 кап.

**№№ 5 и 6 Казка аб вадзе,** Бэльлями. (Пол. и руск. лит.). Цэна па 3 кап.

**№№ 7 и 8 Цукер.** Написаў Вацюк Тройца. (Польск. и руск. лит.). Цэна па 4 кап.

Усе гэтые книжки можна купляць ва ўсих книгарнях; глаўны склад у канторы газэты „Наша Нива“, Вильня. Виленская вулица № 20 (рог Новай). Тамака можна купляць книжки:

1) **Вязанка** Янки Лучыны.—4 кап. (руск. л.)
2) **Казки** выдаў А. К.—3 кап. (руск. лит.)
3) **Беларуски лемэнтар,** або першая навука чытання—6 кап. (польск. и руск. лит.)
4) **Першае чытанне** для дзетак беларусаў. Написала Цйотка.—6 кап. (пол. и рус. л.)
5) **Дудка беларуская** Мацея Бурачка (Ф. Богушэвича). Цэна 25 кап. (польск. лит.)
6) **Гуторки аб неби и зямли.** — Цэна 15 кап. (рускими лит.).
7) **Pan Tadeuš** A. Mickiewiča. Z polskaho pierałažyŭ W. Marcinkiewič. Cena 25 kap.
8) **Hapon** Wincuka Marcinkiewiča. Cena 15 k.

**Пачтовые Беларуские писульки** (атқрытки з рысунками). Штука 5 кап.

Хто купляе шмат, тым даецца скидка.

Рэдактор-Выдаўца А. Ўласоў.

Друкарня М. Кухты, Дворцовая, д. № 4.